Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 КРАСАВІКА 2018 г. СЕРАДА № 69 (28685)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 10 красавіка сустрэўся з кіраўнікамі і супрацоўнікамі найбуйнейшых дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Сустрэча прайшла на базе Белтэлерадыёкампаніі. У тэлестудыі разам з кіраўніком дзяржавы прысутнічалі больш за 130 журналістаў, якія прадстаўлялі Белтэлерадыёкампанію, Другі нацыянальны тэлеканал, Сталічнае тэлебачанне, інфармагенцтва БЕЛТА, рэдакцыю газеты «СБ. Беларусь сегодня», Выдавецкі дом «Звязда» і нацыянальны філіял Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мир». Шчырая гутарка доўжылася каля чатырох гадзін.

# КАМПЕТЭНТНА ПРА НАДЗЁННАЕ

## Прэзідэнт сустрэўся з журналістамі і кіраўнікамі СМІ

**Аляксандр Лукашэнка адразу прапанаваў правесці сумленную і адкрытую размову. Прадстаўнікі найбуйнейшых сродкаў масавай інфармацыі мелі магчымасць наўпрост задаць пытанне кіраўніку дзяржавы. Фармат «адкрытай студыі» дазволіў закрануць тэмы, якія найбольш абмяркоўваюцца ў грамадстве, у тым ліку папраўкі ў закон аб СМІ, неабходнасць змен у Канстытуцыі, мемарыял у Курапатах і іншыя.**



Фота БЕЛТА.

**Па даных на 1 красавіка, у Беларусі зарэгістравана 1660 друкаваных СМІ (751 газета, 867 часопісаў, 31 бюлетэнь, 9 каталогаў і 2 альманахі). Акрамя таго, у краіне працуюць 9 інфармацыйных агенцтваў, выходзяць 103 тэле- і 176 радыёпраграм.**

### ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ВОЙНЫ ГОРШЫЯ ЗА ЯДЗЕРНЫЯ

На пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ён прыйшоў не на прэс-канферэнцыю, а на шчырую гутарку. «У нас тут няма праплачаных, няма тут сваіх і чужых. Мы ўсе робім адну справу», — сказаў ён. Прэзідэнт падкрэсліў, што на сустрэчу прыйшлі не проста журналісты, але грамадзяне, свядомыя і адукаваныя, добра інфармаваныя. Мэта размовы адна — каб была карысць для ўсіх прысутных.

Нагодай для такой сустрэчы стаў пачатак новага этапу ў дзейнасці журналістаў. Працаваць у гэтай сферы па-старому нельга, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым казаць, што раней было дрэнна, не варта, бо без таго добрага, што ўжо створана ў журналістыцы, новы віток развіцця немагчымы. «Я ўвогуле прыхільнік не разбурэння, а стварэння. Я прыхільнік не рэвалюцыі, а эвалюцыйнага працэсу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што рэвалюцыі патрабуюць выдаткаў і пасля — ліквідацыі наступстваў. «Нашы журналісты — гэта святыя людзі. У іх яшчэ цепліцца, нягледзячы на тое, што свет ашалеў, адурэў, шчырасць, дабрыня і праўдзівасць. Гэта якасці, якія я цаню ў любым калектыве, у любым чалавеку», — сказаў Прэзідэнт.

Сутнасць новага этапу — не столькі ў кадравым абнаўленні, хоць і гэта важна. Задача для кіраўніцтва, перш за ўсё дзяржаўных тэлеканалаў, газетных холдынгаў, якую ставіць сам час, — барацьба за розумы і душы беларусаў. Інакш незалежную Беларусь будаваць немагчыма. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што мы жывём у вельмі насычанай інфармацыйнай прасторы, любыя факты распаўсюджваюцца са скорасцю гуку — і пазітыўныя, і негатыўныя. «Усё гэта ператварылася сёння ў інфармацыйную вайну», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Менавіта інфармацыйныя войны сталі адметнай рысай XXI стагоддзя. СМІ сталі ўзбраеннем, якое нават больш магутнае, чым ядзернае. Таму што малы зарад у выглядзе нейкай навіны імгненна ахоплівае ўсю планету. Таму свабода слова мае і адваротны бок.

«Ужо стала брэндам, што Беларусь — выключна мірная краіна. Ніякая агрэсія ніколі не будзе зыходзіць з нашай зямлі. Але і ў крыўду мы не павінны сябе даваць як у ваенным, так і ў інфармацыйным дачыненні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. І вайны ў традыцыйным разуменні без інфармацыйнай быць не можа, лічыць ён, таму ўсё пачынаецца з журналістаў, задача якіх — фарміраваць канструктыўную грамадскую думку праз своечасовую аб'ектыўную падачу матэрыялаў. Па словах Прэзідэнта, сёння людзі стаміліся ад інфармацыйнай сметніцы, у якую іх спрабуюць акунуць, выкарыстоўваючы сусветнае сеціва. Але якасць інфармацыі залежыць перш за ўсё ад тых, хто стварае кантэнт. Таму ўсё больш запатрабаванай становіцца якасная журналістыка з аўтарскай пазіцыяй, дакладнымі фактамі, глыбокай аналітыкай.

### ЗРАБІЦЬ ПАМЫЛКУ НЕ СТРАШНА, ГОРШ — НЕ РАБІЦЬ НІЧОГА

Актуальная задача для тэлебачання — поўны пераход вяшчання на фармат высокай якасці. І хоць некаторыя нашы тэлеканалы ўжо перайшлі на яго, але амаль увесь свет гэта зрабіў ужо досыць даўно. Праўда, такі фармат патрабуе выключна якаснай аператарскай работы, каб «карцінка звінела». Таму кіраўнік дзяржавы прапанаваў хоць бы двух-трох аператараў ад кожнага тэлеканала вучыць асобна, каб яны стваралі сапраўды якасную карцінку.

У прапановах змяненняў у закон аб СМІ, задача якіх — абараніць беларусаў ад неправеранай, несапраўднай інфармацыі, ёсць норма для тэлебачання і развіцця айчыннага кантэнту. «Гэта стане моцным стымулам праграм і матэрыялаў, якія паказваюць дасягненні нашай краіны за гады незалежнасці», — сказаў Прэзідэнт і дадаў, што з дапамогай журналістаў Беларусь мусіць дастойна гучаць на палітычнай, спартыўнай і культурнай арэнах.

Асобнае пытанне — хто і дзе рыхтуе будучых работнікаў сродкаў масавай інфармацыі. Падаецца, што праблем не павінна быць, бо ў краіне ёсць профільны інстытут, аднак у сферы журналістыкі працуе хто хоча, але часта не яго выпускнікі. У гэтым няма нічога дрэннага, але пажадана, каб людзі адразу арыентаваліся і траплялі ў профільную ВНУ. «Задача Інстытута журналістыкі — знаходзіць, шукаць, выхоўваць таленавітых людзей, зрабіць з іх баявыя адзінкі на інфармацыйным полі. Сёння ж частка нашых студэнтаў, на жаль, сыходзіць незразумела куды. Гэта дрэнна, і над гэтым трэба сур'ёзна папрацаваць і кіраўніку Адміністрацыі, і яе новаму намесніку. Гэта праблема ўсіх нашых ВНУ», — лічыць Прэзідэнт.

Наперадзе маштабныя мерапрыемствы — Еўрапейскія гульні, дзіцячае Еўрабачанне, чэмпіянат свету па хакеі. «Я ўпэўнены, што вы асэнсоўваеце, якія надзеі народ ускладае на вас (журналістаў. — **«Зв».**). І хацелася б, каб вы не чакалі ніякіх штуршкоў, ніякіх імпульсаў. Дзейнічайце! Выдавайце ідэі, стварайце, дасягайце поспехаў. Але нават калі вы памыліцеся — за памылку ж ніхто не карае», — кажа кіраўнік дзяржавы. Горш за ўсё, калі журналіст нічога не робіць, працуе па-старому, па каляі.

### ІНФАРМАЦЫЯ З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ. АД ЧЫНОЎНІКАЎ!

Кіраўнік дзяржавы выказаўся і пра стаўленне да свабоды выказваць сваё меркаванне, калі яно не прыносіць шкоды грамадству. «Калі чалавеку рот закрыў — на кухні ты ж кожнаму рот не закрыеш. Гэта будзе зусім дрэнна», — лічыць Прэзідэнт. Напрыклад, калі збіраецца нарада з удзелам кіраўніка дзяржавы, то заўжды заклікаюць некалькі чалавек з адрознымі пунктамі гледжання, і іншых падыходаў быць не можа, падкрэсліў ён.

**Ірына АКУЛОВІЧ, нядаўна прызначаны генеральны дырэктар БЕЛТА,** звярнулася да тэмы інфармацыйнай бяспекі. «Сфера інфармацыйных войнаў — непазнаная, гэта сапраўды ў большасці — псіхалогія. Вы кажаце, што трэба змагацца за розумы і душы, але маніпуляваць жа імі нельга. А маніпулююць», — сказала яна.

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### КІТАЙ ЗНІЗІЦЬ ШЭРАГ ПОШЛІН НА ІМПАРТНЫЯ ТАВАРЫ

Пры гэтым у значнай ступені будуць зніжаны пошліны на ўвоз аўтамабіляў, заявіў старшыня КНР Сі Цзіньпін на цырымоніі адкрыцця штогадовага Азіяцкага эканамічнага форуму ў Боаа. Паводле яго слоў, Кітай мае намер павялічваць імпарт тавараў з унікальнымі характарыстыкамі, на якія ў насельніцтва краіны ёсць попыт. «Мы таксама спадзяёмся, што развітыя краіны перастануць уводзіць штучныя абмежаванні ў сферы нармальнага і справядлівага гандлю высокатэхналагічнай прадукцыяй, а таксама палегчаць для Кітая экспартны кантроль па гэтым відзе тавараў», — дадаў Сі Цзіньпін. Ён таксама нагадаў, што ў лістападзе гэтага года ў Шанхаі пройдзе першая міжнародная выстаўка China International Import Expo, якая стане штогадовай. На думку Сі Цзіньпіна, Expo стане добрай пляцоўкай для далейшага адкрыцця кітайскага рынку для тавараў з усяго свету.

### ЗМЯНЕННЕ КЛІМАТУ АКАЖА СУР'ЁЗНЫ ЎПЛЫЎ НА ГРЭЦЫЮ

Глабальнае змяненне клімату акажа прамое і ўскоснае ўздзеянне на Грэцыю: надвор'е будзе гарачэйшае, ападкаў стане менш, заявіў выкладчык факультэта фізікі ўніверсітэта Патры і лабараторыі фізікі атмасферы Афанасіяс Аргірыу ў інтэрв'ю афінскаму агенцтву навін АМНА. «З-за працяглай берагавой лініі краіны многім раёнам пагражае павышэнне ўзроўню мора, якое ацэньваецца ў межах ад 0,2 да 2 метраў. Чакаецца памяншэнне колькасці ападкаў ад 5 % да 9 %, павышэнне тэмпературы на 3-4,5 градуса па Цэльсію, павелічэнне інтэнсіўнасці сонечнай радыяцыі і павелічэнне інтэнсіўнасці пасатных вятроў», — мяркуе вучоны. На яго думку, апошнія два наступствы «могуць аказаць станоўчы ўплыў на вытворчасць сонечнай і ветравой энергіі». Акрамя гэтага, змены клімату акажуць ускосны ўплыў на розныя сектары эканомікі краіны, такія як сельская гаспадарка, турызм, транспарт, лічыць Аргірыу.



### САМЫМ СТАРЫМ МУЖЧЫНАМ НА ПЛАНЕЦЕ СТАЎ 112-ГАДОВЫ ЯПОНЕЦ

Грамадзянін Японіі Масадзо Нонака ва ўзросце 112 гадоў і 259 дзён прызнаны самым старым мужчынам планеты, паведамляецца на афіцыйным сайце Кнігі рэкордаў Гінеса. Па даных арганізацыі, віцэ-прэзідэнт японскага філіяла Эрыка Агава наведала новага рэкардсмена ў яго родным горадзе на востраве Хакайда, каб уручыць сертыфікат за яго рэкорд. «Дасягненне спадара Нонакі выдатнае, ён можа навучыць нас усіх важнаму ўроку каштоўнасці жыцця і таму, як перавышаць ліміты чалавечага даўгалецця», — заявіў галоўны рэдактар Кнігі рэкордаў Гінеса Крэг Глендэй. Як паведамляецца, Нонака нарадзіўся 25 ліпеня 1905 года. У рэкардсмена сем братоў і сястра, якія жывуць непадалёк ад яго ў пасёлку Асёро на востраве Хакайда, і пяцёра дзяцей. У вольны час на пенсіі Нонака любіць глядзець тэлевізар, чытаць газеты і песціць сябе цукеркамі і тартамі. Нонака не першы японец, які атрымаў званне самага старога мужчыны планеты, раней ім быў прызнаны Дзіраэмон Кімура, які нарадзіўся 19 красавіка 1897 года і памёр ва ўзросце 116 гадоў 54 дзён. Самым старым чалавекам, які жыў на планеце, быў прызнаны Жан Луіз Кальман, які дажыў да 122 гадоў і 164 дзён.

ISSN 1990 - 763X

18069>

## КОРАТКА

Бальніцы 14 і 28 красавіка будуць працаваць па графіку суботняга дня, 15 і 29 красавіка — выхадного дня, 16 і 30 красавіка — працоўнага дня, 17 красавіка і 1 мая — святочнага дня. Работа паліклінік і аптэк 14 і 28 красавіка будзе арганізавана па графіку рабочага дня, 15 і 29 кастрычніка — выхадного дня, 16 і 30 красавіка — суботняга дня, 17 красавіка і 1 мая — святочнага дня.

**Харчовыя тавары ў сакавіку падаражэлі на 0,6 % у параўнанні з лютым 2018 года і на 4,6 % у параўнанні з сакавіком 2017 года. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 0,9 % у параўнанні з лютым 2018 года і на 2,7 % у параўнанні з сакавіком папярэдняга года.**

Гледачы X Міжнароднага фестывалю тэатраў лялек, які пройдзе 18—21 мая ў Мінску, змогуць убачыць 14 пастановак з сямі краін. Выбар пастановак на фестываль грунтаваўся на тым, наколькі работа адлюстроўвае культуру краіны.




## У абцугах кляшчоў

### Як засцерагчыся ад няпрошаных насякомых?

**Кляшчы з'яўляюцца ранняй вясной у сонечныя дні на праталінах. Вось і сёлета першыя звесткі аб тым, што кляшчы атакавалі людзей, прыйшлі з Брэсцкай вобласці. Пікі іх актыўнасці прыпадаюць на май — чэрвень і жнівень — верасень. Гэтыя невялікія істоты з'яўляюцца пераносчыкамі многіх хвароб. Самыя распаўсюджаныя з іх — клешчавы энцэфаліт і Лайм-барэліёз. Чым жа яны небяспечныя?**

Клешчавы энцэфаліт — гэта інфекцыя, якая характарызуецца ліхаманкай, інтаксікацыяй і пашкоджаннем галаўнога і спіннога мозга. Ён можа прывесці да ўскладненняў неўралагічнага або псіхіятрычнага характару або нават смерці.

Лайм-барэліёз — інфекцыя, якая «б'е» па суставах, сэрцы, нервовай сістэме, вачах. Як і ў выпадку з клешчавым энцэфалітам, заражэнне можа скончыцца лятальным канцом.

— Кляшчы сядзяць на нізкай траве, на хмызняку, — кажа **Уладзімір ПАШКОВІЧ, загадчык аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.** — Высока яны не ўздымаюцца і на людзей з дрэваў не падаюць — дарэчы, гэта адно з устойлівых памылковых перакананняў. Яны сядзяць у позе чакання. Калі праходзіць чалавек або жывёла і дакранаецца да галінкі з кляшчом, то ён чапляецца пярэднімі лапкамі за ахвяру і пачынае паўзці туды, дзе крывяносныя сасуды вельмі блізка прылягаюць да скуры. Гэта, як правіла, пахавая вобласць, падмышачныя ўпадзіны. І як толькі клешч дабраўся да такога месца, ён пачынае сваю «чорную справу». Па досведзе мінулага году, колькасць заражаных Лайм-барэліёзам кляшчоў даходзіла да чвэрці ад агульнай колькасці. Прыкладна 3,5 % былі заражаны клешчавым энцэфалітам. Здараецца так, што адна істота адначасова з'яўляецца пераносчыкам дзвюх хвароб.

Клешч сваімі парнымі сківіцамі пракусвае скуру і ўводзіць у рану джала. Ён выдзяляе спецыяльныя рэчывы, якія перашкаджаюць згортванню крыві, каб джала не захрасла ў ране, і клейкае рэчыва, каб утрымацца на скуры. Адчуць момант укусу немагчыма — агрэсар пры ўкусе ўводзіць анестэтык.

Пасля ўкусу клешч выглядае, як вішнёвая костачка. Насмактаўшыся крыві, ён звычайна павялічваецца ў 10—15 разоў. Прычым звычайна ў дыяметры яго памер не перавышае аднаго-двух міліметраў. Пасля гэтага ён адпадае. Правесці на целе ён можа ад трох да чатырох сутак.

СТАР. 3